**Р. У. Серыкаў, Л. П. Кузьміч**
Завочны факультэт,
Філалагічны факультэт, кафедра беларускай мовы

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ

## У АДЗІНСТВЕ ТРАДЫЦЫЙНАЙ І Е-АДУКАЦЫІ

У апошнія дзесяцігоддзі XX ст. перад айчыннымі ваеннымі вучонымі былі пастаўлены незвычайныя, на першы погляд, задачы, пра якія расказвае ў сваёй кнізе Д. С. Сакалоў [1]. Тады яшчэ не было паняцця пра дыстанцыйнае навучанне ўвогуле, ідэі ж пра глабальную сетку Інтэрнэт толькі выношваліся і здаваліся фантастычнымі. Але тыя праблемы, дзеля якіх былі прыцягнуты людзі з незвычайнымі магчымасцямі, паспяхова вырашаліся (у глабальным маштабе!), неабходныя сродкі і сілы знаходзіліся, вынікі былі станоўчымі. Перш чым вярнуцца да далейшых разважанняў, скажам наступнае.

Як вядома, працэс навучання адбываецца з удзелам трох суб’ектаў: выкладчыка, навучэнца і той навучальнай установы, да якой яны абодва маюць дачыненне. Не толькі ў Беларусі, але і ў многіх цывілізаваных краінах на працягу апошняга дзесяцігоддзя многа гаворыцца пра адукацыю на адлегласці. Гэта адбываецца ў сітуацыі, калі пад працэс глабалізацыі падпадаюць усе істотныя праявы жыцця, што акружаюць сучаснага чалавека. Развіццё і памнажэнне ведаў, як і іншыя спадарожныя глабалізацыйныя працэсы, з’яўляюцца вытворнымі камп’ютарных тэхналогій апошніх 10–15-ці гадоў і той мяжой, якая аддзяляе “старую” і “новую” адукацыю. Аднак да сёння не хапае

комплекснага падыходу да аналізу прычын, якія вымушаюць аддаць перавагу менавіта дыстанцыйнаму навучанню перад традыцыйным. Змены ў спецыфіцы адукацыі (у сувязі з распаўсюджаннем камп'ютарнай тэхнікі і інфармацыйных тэхналогій) адбыліся на вачах аднога пакалення, таму не адразу усведамляюцца намі і іх перавагі, і іх недахопы, і з цяжкасцю прагназуюцца вынікі такога навучання, якія маюць праявіцца значна пазней, у працэсе далейшай прафесійнай дзейнасці цяперашніх навучэнцаў.

Паводле дэфініцыі сучасных польскіх педагогаў Й. Мішкэ і А. К. Станіслаўскай, "пад ***е-адукацыяй*** мы разумеем такую адукацыйную сістэму, ці сукупнасць установ, асоб і дзеянняў – а г. зн. установы, законы, методыку навучання, працэс навучання і яго арганізацыю і, нарэшце, стасункі паміж удзельнікамі гэтага працэсу – якія вядуць да здабывання студэнтам новых ведаў, уменняў і кампетэнцый пры выкарыстанні сучасных інфармацыйных тэхналогій. Пад ***навучаннем*** жа мы разумеем працэс як перадачы ведаў ад настаўніка, так і працэс засваення іх студэнтам, а таксама і самастойнага здабывання ім новых уменняў. Е-адукацыі мы супрацьпастаўляем ***навучанне традыцыйнае***. Пад гэтым тэрмінам мы разумеем усялякага роду дыдактычныя працэсы, пры якіх выступае адзінства месца і часу ўдзельнікаў працэсу, якія праводзяцца класічнымі дыдактычнымі метадамі з захаваннем існуючых метадаў установы, якая арганізуе такі працэс" [2].

Істотным з'яўляецца тое, што дыстанцыйнае навучанне – не толькі перасылка электронных матэрыялаў, карыстанне CD і інтэрнэтам, перамовы па тэлефоне і скайпе, г. зн. не спосаб камунікацыі, але, перш за ўсё, арганізацыя навучання як такога. Гэта тлумачыцца тым, што для таго, каб дабіцца інтэрактыўнага ўзаемадзеяння *выкладчык – студэнт*, неабходна спецыфічная арганізацыя працэсу іх зносін.

Характэрнымі рысамі інфармацыйнага грамадства з'яўляюцца:

– вялікі аб'ём даступнай інфармацыі, а дзякуючы камп'ютарам і інтэрнэту агромністыя магчымасці яе перадачы, збору, захоўвання, пераапрацоўкі, сартавання і, нарэшце, выкарыстанне для прагназавання будучыні у амаль усіх сферах дзейнасці чалавека;

– глабалізацыя ўсіх сфер дзейнасці чалавека, у тым ліку і адукацыі;

– мабільнасць людзей у шматмоўнай і шматкультурнай рэальнай або віртуальнай прасторы;

– падняцце статусу ведаў і крэатыўнасці да рангу капіталу, які прыносіць усё большы прыбытак;

– імкненне да прафесіяналізацыі усё большай і большай колькасці працоўных месцаў;

– стварэнне новых і зніканне непрыдатных спецыяльнасцей;

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ

– перамяшчэнне галоўнай крыніцы грамадскага прагрэсу з ВНУ да вялікіх міжнародных карпарацый або спецыялізаваных урадавых агенцтваў;

– прынящце на сябе часткі адукацыйных задач рынкавымі суб'ектамі (прадпрыемствы, якія аказваюць розныя адукацыйныя паслугі і так званыя карпарацыйныя ўніверсітэты).

Перад ВНУ будуць ставіцца новыя задачы, мадыфікуемыя, перш за ўсё, колькасцю карыстальнікаў і глабалізацыяй адукацыі. Самымі распаўсюджанымі пастулатамі навучальных устаноў з'яўляюцца наступныя:

– ахоп вучобай як мага большай колькасці людзей, імкненне да 100%-га ахопу грамадства універсітэцкай адукацыяй;

– удзел у пастаяннай актуалізацыі ведаў членаў грамадства і аказанне ім дапамогі ў дастасоўванні да зменлівых умоў цывілізацыі;

– стварэнне інтэлектуальных эліт;

– інтэрнацыяналізацыя навучання;

– высокая эфектыўнасць навучання і зніжэнне яго коштаў;

– супрацоўніцтва ў вырашэнні асабліва складаных праблем міжасобаснага узаемадзеяння, прадбачанне будучыні, прагназаванне цывілізацыйнага прагрэсу. Гэтая складаная задача нязменна накіроўваецца ў адрас выкладчыкаў ВНУ з надзеяй, што яны змогуць яе вырашыць.

Чалавек у адукаваным грамадстве будучага павінен мець здольнасці лёгкага і хуткага паглынання новай інфармацыі, адбору і засваення патэнцыяльна карысных звестак для іх далейшай паспяховай перапрацоўкі ў веды аб свеце. Сучасны чалавек мусіць паспяваць за зменамі тэхнічнага прагрэсу, хуткасць якіх настолькі вялікая, што патрабуе каласальнага ўдзелу навучальных устаноў у актуалізацыі або набыцці новых ведаў работніка.

Да параўнальна нядаўняга часу адзінай знешняй дапамогай для настаўніка быў падручнік. Задачы, звязаныя з перадачай ведаў, павінен быў вырашаць сам выкладчык, і ніхто яму ў гэтым не дапамагаў. З'яўленне лічбавай тэхнікі намнога ўскладніла і індывідуалізавала гэты працэс. Цяпер патэнцыяльна кожны выкладчык (ці настаўнік) можа стаць аўтарам, мастаком, тэхнічным рэдактарам, праекціроўшчыкам і выканаўцам віртуальных эксперыментаў, рэжысёрам, сцэнарыстам, складальнікам і распаўсюджвальнікам падручніка, прыстасаванага да адзінага прадмета і слухача. Тэарэтычна гэта нібы магчыма, але на практыцы выкладчык будзе карыстацца паслугамі спецыялізаваных фірм, якія задбаюць пра тое, каб перадаць выкладчыку тое, чаго ён сам не зможа запісаць, намаляваць і прыгатаваць. Педагог мусіць замаўляць патрэбныя матэрыялы, не зважаючы на наяўнасць дзяржаўных межаў і рэальных адлегласцей.

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ

Сярод важных матываў, якія схіляюць сучасных аналітыкаў і педагогаў розных краін да пашырэння дыстанцыйнага навучання, выдзяляюцца тры ключавыя:

1. Мінімалізацыя энергіі. Гэта істотны матыў як з гледжання студэнта, выкладчыка, так і ўстановы адукацыі. Для навучэнца тут можа быць важным момант неабавязковасці кожнаразовага выезду да школы; для выкладчыка – магчымасць працы дома; для ВНУ – скасаванне шэрагу інвестыцый у рамонты аўдыторый.

2. Уласцівы чалавечай прыродзе дух даследчыка (імкненне да пераадолення існуючых абмежаванняў). Напрыклад, студэнтам захочацца віртуальна мігрыраваць за межы краіны або ў іншыя ВНУ у пошуках ведаў або адпаведных спецыялістаў. У выкладчыкаў будзе магчымасць пазбыцца абмежаванняў у традыцыйнай перадачы ведаў, а установы адукацыі змогуць выйсці далёка за межы свайго былога ўплыву і ажыццяўляць набор у глабальным маштабе, шырока прапагандуючы выгоды і льготы навучання, паляпшаючы такім чынам канкурэнтнасць на рынку адукацыі.

3. Эканамічныя фактары (мінімалізацыя выдаткаў або максімалізацыя прыбыткаў). Для студэнтаў гэта будзе ашчаджэнне выдаткаў на праезд да ВНУ або на пражыванне на кватэрах. Для выкладчыка – узрост ягоных даходаў, а для установы адукацыі – зніжэнне коштаў працы і павышэнне прэстыжу ВНУ.

На практыцы пакуль атрымліваецца інакш, і на сучасны стан рэчаў у е-адукацыі уплывае рад фактараў:

– навучальныя установы не маюць дастаткова сродкаў, каб распачаць новыя формы навучання, не могуць свабодна наймаць спецыялістаў ў розных галінах ведаў як айчынных, так і замежных, не маюць права ствараць уласныя вучэбныя праграмы згодна з патрабаваннямі часу і запытамі навучэнцаў;

– выкладчык, працуючы ў адрыве ад установы адукацыі можа трактаваць працу як хобі і ў лепшым выпадку абмяжуе сваю дзейнасць размяшчэннем дыдактычных матэрыялаў у інтэрнэце і перапіскай са студэнтамі па электроннай пошце;

– патэнцыяльны студэнт пакуль не выбірае дыстанцыйнае навучанне па прычыне сціплых прапаноў з боку ВНУ, якія, да таго ж, не з’яўляюцца вядучымі і прэстыжнымі;

– няма пакуль “націску” Замоўцы (навучэнца), па прычыне чаго Выканаўца (навучальная ўстанова і выкладчык) адчуваюць сябе вольнымі ад новых выклікаў часу.

Такія вывады і аргументы на карысць ці супраць наватарскай (электроннай) і традыцыйнай адукацыі гучаць сёння ва ўсіх цывілізаваных краінах. Амаль не бярэцца пад увагу хіба толькі той факт, што многія

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ

з нас, незалежна ад узросту, ужо даўно ўцягнуты ў е-адукацыю, дзякуючы магчымасці засвойваць і выкарыстоўваць новую, раней не даступную інфармацыю Сеткі і групавацца ў суполкі па інтарэсах, у тым ліку навуковых. Вяртаючыся да пачатковых пасылак артыкула, скажам у заключэнне: прынцыпова новыя веды нараджаліся раней і будуць нараджацца ў далейшым дзякуючы вольнай інтэграцыі навук і накірункаў разнастайных даследаванняў. Інтэрнэт будзе спрыяць сінтэзу далёкасяжных тэхналогій і рэвалюцыйных адкрыццяў дзякуючы зліццю вынікаў творчых пошукаў чалавека ў абласцях навукі і магіі, рэлігіі і містыкі, акультызму і філасофіі, паколькі сама прырода ніколі не ставіла і не ставіць пытання пра першаснасць/другаснасць духу і матэрыі: у ёй усё суіснуе ў гармоніі непахіснага адзінства.

**Літаратура**

1 Соколов, Д. С. Мистика и философия спецслужб [Электронный ресурс] / Д. С. Соколов. – Рэжым доступу: http://www.noocosmology.ru/books-4.html

2 Mischke, Jerzy Dylematy współczesnej jdukacji: nauczanie tradycyjne czy zdalne? [Электронный ресурс] / Jerzy Mischke, Рэжым доступу: http://home.agh.edu.pl/~mischke/upload/File/artykoly/Dylematy_wspolczesnej_edukacji.pdf

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ